**Т.І.Васюк,**
*дацэнт*

# СІМВОЛІКА Ў БЕЛАРУСКАЙ КЕРАМІЦЫ

Старажытны чалавек, ствараючы жытло, абсталёўваў яго неабходнымі рэчамі. Многія з іх мелі семантычнае значэнне. Салярныя і антрапаморфныя знакі на вырабах маюць культавае значэнне і сведчаць аб вераваннях нашых далёкіх продкаў. Знакі на гаршках старажытных культур з'яўляюцца сінтэтычным уяўленнем чалавека аб яго месцазнаходжанні ў космасе. Нахіленыя рысачкі на гаршку абазначалі дождж, ромбы з кропкай у цэнтры — засеяную зямлю і г. д. Гаршкі былі патрэбны чалавеку, каб захаваць ураджай, згатаваць ежу.

Керамічныя вырабы адносяцца да матэрыяльнай культуры, якая напаўняе душу касмічным адчуваннем сусвету. Чарапкі амаль вечна захоўваюцца ў зямлі, мабыць, таму, што з'яўляюцца часткай глебы, якая загартавана агнём і сфармавана пры дапамозе вады.

Для сучасніка старажытная кераміка "жыве" ў музейных экспанатах. Аднак мастакі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва могуць вярнуць стыль "архаікі" ў наш урбанізаваны час.

Эпоха неаліту на тэрыторыі Беларусі адзначана пачаткам вытворчасці глінянага посуду. У краіне вядома каля шасцісот паселішчаў гэтай эпохі. Археолагі лічаць, што існавала больш дзесяці археалагічных культур, кожная са сваімі асаблівасцямі і адметнымі рысамі.

Для днепраданецкай культуры (Палессе) характэрныя гліняныя вырабы з вострым донцам. Такія вырабы абпальваліся на адкрытых кастрышчах. У цяперашні час беларускія мастакі-керамісты імкнуцца аднавіць старажытную тэхналогію і спрабуюць гартаваць керамічныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вырабы агнём з дроў у ямах (тэхналогія раку) для надання гаршку незвычайных мастацкіх і хіміка-тэрмічных якасцей.

Усходнюю Беларусь насялялі плямёны верхняднепроўскай археалагічнай культуры. Для яе характэрна арнаментацыя вырабаў у выглядзе ямак лапчатым узорам.

Вёскі Рудня, Глыбаўка Веткаўскага раёна, Сябровічы Чачэрскага, Хадасевічы Рагачоўскага, Камень-8 Пінскага раёнаў — гэта месцы знаходак вастрадонных гаршкоў V—II тысячагоддзяў да н. э.

Прыпяць і Панямонне насялялі плямёны, якія выраблялі і карысталіся ў асноўным вастрадонным посудам з драпанымі лініямі, насечкамі і рыскамі. Пазней на тэрыторыю паўднёва-заходняй Беларусі пранiклі плямёны іншых культур. З'явіліся лейкападобныя, кубкавыя і шарападобныя формы. У III тысячагоддзі да н. э. на тэрыторыі Беларусі адзначана распаўсюджванне амфар.

Паўночную частку краіны насялялі плямёны грабеньчатай ямкавай керамікі, для якой характэрныя круглыя донцы. У другой палове III тысячагоддзя да н. э. на тэрыторыі сучаснай Беларусі жылі плямёны, якія выраблялі кераміку з роўнымі, гладкімі сценкамі.

Пазней на тэрыторыі Беларусі рассяліліся плямёны пражскай культуры. У гэты перыяд выраблялiся ляпныя гаршкі з максімальна расшыраным тулавам у верхняй частцы вырабу, звужаным дном або горлам, кароткай прамой або ледзь адагнутай шыйкай. У пазнейшыя часы кераміка набыла найбольш развітую форму — выпуклае тулава і дасканалы радыусны сілуэт.

У цэнтральнай частцы і на поўначы Беларусі, а таксама ў раёнах Падняпроўя маюцца помнікі банцараўскай культуры, для якой характэрна пласкадонная кераміка з крыху адагнутым венчыкам, апушчанымі плячамі, выпуклым круглабокім тулавам, цыліндраканічным і міскападобным сілуэтам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навукоўцы ўстанавілі, што для кожнай культуры на тэрыторыі Беларусі характэрныя пэўныя рысы, якія выявіліся ў формах і арнаменце гліняных вырабаў. Гладкасценная кераміка выраблялася з дамешкамі ракушачніка і арнаментавалася грэбнем. Частка падняпроўскіх плямёнаў перасялялася на поўнач. З поўдня распаўсюджвалася кераміка шнуравай культуры. У ранні бронзавы век на тэрыторыі Беларусі існавалі некалькі варыянтаў культур шнуравай керамікі. У сярэдзіне бронзавага веку распаўсюдзіліся плямёны тшчынецкай культуры, якія аздаблялі кераміку наразным узорам. Помнікі гэтай культуры часта вылучаюць у асобную, сосніцкую культуру. Для яе характэрныя высокія пласкадонныя гаршкі, якія нярэдка былі арнаментаваны па ўсёй паверхні вырабу. Позні бронзавы век вывучаны недастаткова. Вядома, што на Панямонні, у цэнтральнай Беларусі і на тэрыторыі паўночнай часткі краіны выраблялі штрыхаваную кераміку.

Такім чынам, арнаментацыя керамічных вырабаў візуальна ўспрымаецца як інфармацыя ў выглядзе сістэмы знакаў, піктаграфічных малюнкаў. Гэта свайго роду пісьмо. Носьбітамі такой інфармацыі з'яўляліся ўсе прадметы побыту: прылады працы, адзенне, посуд і інш.

Арнамент — гэта ўзор з рытмічна пабудаваных элементаў. Навукоўцы сцвярджаюць, што зарадзіўся арнамент у эпоху позняга неаліту. У яго матывах выкарыстоўваліся геаметрычныя фігуры: квадраты, ромбы, кругі, фігуры салярных знакаў, раслінныя, зааморфныя і антрапаморфныя знакі. Арнаменты падзяляюцца на лінейныя, лінейна-хвалістыя, зубчата-грабеньчатыя, кропачна-ямкавыя.

Па размяшчэнні і напрамку арнаменты дзеляцца на гарызантальныя, вертыкальныя і дыяганальныя, па кампазіцыйным строі — на сетчатыя, трохкутныя, прамавугольныя, ромбавідныя, паясныя, крыжападобныя, хвалістыя, шашачныя, лентачныя, рамонкавападобныя, акантовачныя, радыусныя і лінейныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На гліняныя вырабы ўзор наносіўся ў сырым стане простым або зубчатым штапмам, грэбенем, палачкай або стэкам, пальцам, тканінай ці скурай. Найбольшага развіцця арнамент дасягнуў у перыяд неаліту (III тысячагоддзе да н. э.). Для гэтага часу характэрны паясны геаметрычны ўзор, выкананы радамі, лентамі, нанесены ў выглядзе адбіткаў. У бронзавы век да арнаменту дадаваўся адбітак шнура. У жалезны век аздабленне керамікі было ў асноўным у верхняй частцы сасуда. Рытуальныя вырабы аздабляліся з верху і ў сярэдзіне. Для традыцыйнай тэхналогіі вырабу архаічнай керамікі характэрныя арганічныя прымесі ў цесце гліны. Часам яны выгаралі не да канца і пакідалі на вырабах дымлены адбітак. Не заўсёды на кастрышчы быў моцны абпал. Дзякуючы аксіду жалеза выраб фарбаваўся з шэрага ў чырвона-тэракотавы колер.

У час позняга неаліту абпал керамікі пачалі рабіць у спецыяльных ямах у выглядзе прымітыўнага горна, тэмпература у якіх дасягала 1000°С і больш. Мінеральныя прымесі плавіліся, адбывалася крышталізацыя, пры якой гаршчок пачынаў “звінець”.

А.А.Бобрынскі лічыў, што ў гэты час у плямёнаў мілаградскай, юхноўскай і дняпроўскай культуры быў распаўсюджаны спосаб ручной лепкі ў выглядзе “ласкутовага нарасту”.

З цягам часу больш дасканалым рабіўся тэхналагічны працэс вырабу керамікі. З’яўляецца посуд з глянцаванай паверхняй. Глянцаванне керамікі мела мастацкую і тэхналагічную якасць. Такі посуд, у якім захоўваліся запасы ежы, упрыгожваўся пучком саломы ці травы на паверхні вырабу ў сырым стане. У славян рабіліся гаршкі з прымесямі пяску і жарствы. Сустракаюцца сасуды, арнаментаваныя па краі венчыка пальцам рукі. Вядомы і гаршкі міскападобнай формы. Такія прысадзістыя гаршкі маюць выразныя плечы і адагнуты край.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Характар старажытнай лепкі складалі раслінныя прымесі ў цесце гліны. З тонкай масы выраблялі вастрадонныя гаршкі з адкрытым верхам. Распаўсюджаны на той час былі вырабы з простым профілем венчыка.

Такім чынам, форма, сілуэт і арнамент гліняных вырабаў адлюстроўваюць пэўныя рысы кожнай з культур, існаваўшых на тэрыторыі сучаснай Беларсі.

**Л.Ф.Голікава,**
*дацэнт*

## ЦАРКОЎНАЯ МУЗЫКА ЯК УВАСАБЛЕННЕ ДУХОЎНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ ДРУГОЙ ЧВЭРЦІ XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Царкоўная музыка беларускіх кампазітараў да нядаўняга часу амаль не была вядома шырокаму колу слухачоў, хаця шэраг аўтараў (М.Анцаў, А.Туранкоў, М.Куліковіч-Шчаглоў, М.Равенскі, А.Валынчык, А.Карповіч, К.Кіслы, Я.Сямашка, А.Стэповіч, В.Селях-Качанскі і іншыя, якіх можна аднесці да беларускай школы царкоўных кампазітараў) вялікую ўвагу ў сваёй творчай дзейнасці надавалі сачыненням духоўнай тэматыкі, лічылі, што менавіта ў такіх творах захоўваюцца духоўныя традыцыі нацыі.

Першым і старэйшым беларускім кампазітарам, які мэтанакіравана звяртаўся да царкоўнай музыкі, быў М.Анцаў, вучань М.Рымскага-Корсакава. У спіс яго царкоўных твораў уваходзяць "Еўхарыстычны канон", "Достойно есть" і інш. Для царкоўных твораў М.Анцава характэрныя лірычнасць, чуллівасць інтанацый і разам з тым урачыстасць. Вядомы даследчык беларускай музыкі Г.дэ Пікарда параўноўвае царкоўныя хары М.Анцава з творамі П.Чайкоўскага, якія былі напісаны ў гэтым жанры.